1. Параўнайце асноўныя святы, якія адзначаліся ў 1970—1980-я гг., з сучаснымі дзяржаўнымі святамі.
2. Якімі прычынамі тлумачылася грамадская актыўнасць новай гістарычнай супольнасці — савецкага народа, да якога таксама належалі і беларусы?
3. Вызначце, аб чым сведчыла скасаванне шостага артыкула Канстытуцыі БССР 1978 г.
4. Складзіце ў сшытку параўнальную табліцу «Асноўныя рысы грамадска-палітычнага жыцця ў БССР» і зрабіце выснову аб іх адрозненні.

| Прыметы для параўнання | Другая палова 1960-х — першая палова 1980-х гг. | Другая палова 1980-х гг. |
|---|---|---|
| Становішча палітычных партый | | |
| Выбары ў Саветы народных дэпутатаў | | |

5. Падрыхтуйце паведамленне на тэму «Беларускія „афганцы“: выкананне інтэрнацыянальнага і канстытуцыйнага абавязку перад Радзімай» і прэзентуйце яго пры правядзенні ўрока абагульнення па раздзеле IV.

# § 22—23. Сацыяльна-эканамічнае становішча ў другой палове 1960-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** Якімі былі новыя галіны прамысловасці, звязаныя з фарміраваннем індустрыяльнага грамадства ў БССР?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць асноўныя дасягненні і супярэчнасці сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1960-х — 1980-я гг.

**Фарміраванне прамысловага комплексу БССР.** У сярэдзіне 1960-х гг. у СССР знізіліся сярэднегадавыя паказчыкі прыросту прадукцыі і прадукцыйнасці працы ў прамысловасці. Адной з прычын гэтых працэсаў з'яўлялася цэнтралізаваная сістэма планавання і кіравання надзвычай складанай народнай гаспадаркай усяго СССР, у тым ліку і БССР. У 1965 г. для аптымізацыі кіравання народнай гаспадаркай у СССР была праведзена эканамічная рэформа. Замест 100 абавязковых планавых паказчыкаў прамысловай прадукцыі, якія вызначала дзяржава, засталіся толькі 8, а астатнія планавалі самі прадпрыемствы. Ранейшы галоўны паказчык работы прадпрыемства — аб'ём усёй выпушчанай прадукцыі — саступіў месца аб'ёму прададзенай прадукцыі. На прадпрыемствах уводзіўся гаспадарчы разлік — метад гаспадарання, пры якім даходы, што атрымлівала прадпрыемства ад рэалізацыі сваёй прадукцыі, павінны былі пакрываць і перавышаць яго выдаткі на вытворчасць. У выніку ажыццяўлення рэформы быў паспяхова выкананы план восьмай пяцігодкі (1966—1970). Яна аказалася самай выніковай у пасляваенны перыяд.


Правообладатель Издательский центр БГУ

У пачатку 1970-х гг. у рэспубліцы першым на гаспадарчы разлік перайшло Міністэрства аўтамабільнага транспарту, якім кіраваў А. Я. Андрэеў.

**Анатоль Яўгенавіч Андрэеў** (1916—2005). Ураджэнец Рагачова. Яго юнацкай марай было стаць машыністам цягніка. Пачынаў ён з качагара паравоза, за адну паездку перакідваў да 20 тон вугалю. Стаў самым маладым машыністам на Заходняй чыгунцы, які працаваў на новым паравозе ІС (Іосіф Сталін), а потым кіраваў міжнародным пасажырскім экспрэсам «Масква — Парыж». Гэта была вельмі адказная праца. За кожную хвіліну спазнення на пагранічную чыгуначную станцыю Негарэлае краіна выплочвала няўстойку ў 25 рублёў золатам. Тут адбывалася перасадка пасажыраў на цягнік заходнееўрапейскай веткі, якая адрознівалася ад той, што існавала на тэрыторыі СССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Я. Андрэеў стаў адным з кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі. Сярод эпізодаў яго баявой біяграфіі — дзейнасць у складзе дыверсійнай групы К. Заслонава на Аршанскім чыгуначным вузле, кіраванне паветрана-дэсантным партызанскім атрадам імя камсамола Беларусі, які дзейнічаў на тэрыторыі Беласточчыны. У 1963 г. стаў самым маладым у БССР міністрам аўтамабільнага транспарту. А. Я. Андрэеў — ганаровы грамадзянін Оршы, Шчучына, Мастоўскага раёна.



А. Я. Андрэеў

За заслугі ў развіцці аўтамабільнага транспарту і актыўную грамадскую дзейнасць яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Пасля выхаду на пенсію ён узначальваў Беларускі рэспубліканскі савет ветэранаў вайны і працы.

*Ці здзейснілася юнацкая мара А. Я. Андрэева? А якая мара ёсць у вас? Што вы робіце для таго, каб яна ажыццявілася?*

У 1970—1980-я гг. у БССР была наладжана вытворчасць на шынным камбінаце ў Бабруйску, на металургічным заводзе ў Жлобіне, працягваўся выраб мінеральных угнаенняў на калійным камбінаце ў Салігорску, быў пабудаваны нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры.

У сярэдзіне 1980-х гг. Беларусь стала адной з самых эканамічна развітых рэспублік СССР. Але развіццё эканомікі Беларусі, як і раней, адбывалася экстэнсіўным шляхам за кошт павелічэння колькасных паказчыкаў. Сярод іх — будаўніцтва новых прадпрыемстваў, узрастанне колькасці працоўных і аб'ёму выдаткаваных грошай з дзяржаўнага бюджэту. Пры гэтым істотна знізіліся якасныя паказчыкі, у прыватнасці, тэмпы росту прадукцыйнасці працы. Да таго ж эканамічнае развіццё ва ўмовах супрацьстаяння паміж СССР і капіталістычнымі краінамі залежала ад патрэб абароннай прамысловасці. Так, напрыклад, значная большасць колавых шасі для мабільных ракетных комплексаў была створана ў спецыяльным канструктарскім бюро МАЗа. У той жа час выпуску

*Папрацуйце, выкарыстоўваючы прыём ключавога слова, са зместам гэтага абзаца. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

якасных прадуктаў народнага спажывання надавалася другараднае значэнне. Узрастаў дэфіцыт (недахоп) тавараў першай неабходнасці. Другая палова 1960-х — першая палова 1980-х гг. адзначыліся далейшым развіццём транспарту. Адбылася электрыфікацыя асноўнай чыгуначнай лініі Брэст — Масква. Камсамол Беларусі ўзяў актыўны ўдзел у будаўніцтве чыгуначнай Байкала-Амурскай магістралі (БАМа). Была здадзена ў эксплуатацыю першая лінія Мінскага метрапалітэна.

Развіццё прамысловасці прывяло да павелічэння колькасці гарадскога насельніцтва. Большая частка моладзі з вёсак перасялялася ў гарады, дзе ўзровень жыцця быў вышэйшым. Калі ў 1966 г. гарадскіх жыхароў налічвалася 3,3 млн чалавек (39 % ад агульнай колькасці насельніцтва БССР), дык у 1985 г. — 6,2 млн (62 %).

**Развіццё сельскай гаспадаркі.** У 1960—1970-я гг. распачалася хімізацыя сельскай гаспадаркі — унясенне ў глебу штучных угнаенняў. Колькасць такіх угнаенняў з 1965 па 1985 г. павялічылася амаль у 20 разоў. Таксама працягвалася меліярацыя. Было асушана каля 1 млн га зямельных плошчаў. Сельская гаспадарка ў БССР спецыялізавалася на развіцці мясной і малочнай жывёлагадоўлі, вытворчасці льну-даўгунцу, цукровых буракоў, бульбы (**1). У рэспубліцы разгарнулася будаўніцтва вялікіх механізаваных фермаў, комплексаў па адкорме буйной рагатай жывёлы і птушкафабрык. Аднак разам з гэтым пагоршылася сітуацыя з аховай навакольнага асяроддзя, у тым ліку ў раёнах размяшчэння жывёлагадоўчых комплексаў. Празмерная хімізацыя выклікала абвастрэнне экалагічных праблем. Каля 1/3 усіх меліяраваных плошчаў зрабіліся перасушанымі і малаэфектыўнымі для земляробства. Навуковую канцэпцыю эфектыўнай меліярацыі зямель з улікам захавання ўрадлівасці глебы і дзейснай аховы навакольнага асяроддзя распрацаваў доктар сельскагаспадарчых навук С. Г. Скарапанаў.



С. Г. Скарапанаў

**Сцяпан Гардзеевіч Скарапанаў** (1910—1999). Нарадзіўся на Гомельшчыне, закончыў Горацкі сельскагаспадарчы інстытут (цяпер — Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія). У верасні 1939 г. быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію. Ужо ў час вайсковай службы абараніў дысертацыю на ступень кандыдата сельскагаспадарчых навук. У гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў шлях ад салдата да падпалкоўніка, удзельнічаў у абароне Масквы і Ленінграда, у вызваленні Варшавы і штурме Берліна. Як вучоны лічыў, што Беларусь не гатова да маштабнай меліярацыі, а праводзіць яе трэба з абавязковым угнаеннем асушаных зямель. На жаль, яго пазіцыя не была ў поўнай меры ўлічана. У 1961—1972 гг. займаў пасаду міністра сельскай гаспадаркі БССР, стаў акадэмікам. За гэты час прадукцыя сельскай гаспадаркі БССР павялічылася на 40 %, а вытворчасць збожжа — больш чым напалову. У сваёй прафесійнай дзейнасці кіраваўся прынцыпам: «Не той араты, хто добра арэ, а той, хто пашай сваёй любуецца».

*У чым заключалася пазіцыя С. Г. Скарапанава наконт меліярацыі забалочаных зямель?*



Правообладатель Издательский центр БГУ

У рэспубліцы значна палепшылася забеспячэнне сельскай гаспадаркі тэхнікай. У 1972 г. імянны трактар «Беларус» з заводскім нумарам 1 000 000 па даручэнні П. М. Машэрава быў уручаны славутаму механізатару саўгаса «Лагаза» Лагойскага раёна Надзеі Іванаўне Куніцкай (1925—2009). Годам раней П. М. Машэраў уручыў ёй зорку Героя Сацыялістычнай Працы. А потым завітаў у гаспадарку, дзе яна была механізатарам, і пацікавіўся, як працуецца на імянным трактары. Свой прафесійны выбар Н. І. Куніцкая зрабіла яшчэ ў юнацтве. У пасляваенны час сама хадзіла за плугам, арала і баранавала зямлю. А калі ў калгасе з'явіўся першы трактар, то запісалася на курсы механізатараў, каб навучыцца ім кіраваць. І хаця яе родныя былі супраць такога выбару — маўляў, гэта не жаночы занятак, яна абрала менавіта прафесію трактарысткі. На юбілей Н. І. Куніцкай прэзентавалі той самы імянны трактар МТЗ-52, толькі адрэстаўраваны і абноўлены.




Н. І. Куніцкая

*1. Вызначце, якімі абставінамі быў абумоўлены прафесійны выбар Н. І. Куніцкай.*
*2. Якой прафесіяй вы жадаеце авалодаць у будучым? Што для гэтага робіце ўжо зараз?*

**Узровень жыцця народа.** Па выніках Усесаюзнага перапісу 1979 г. насельніцтва БССР складала больш за 9,5 млн чалавек. У 1967 г. рабочыя і служачыя былі пераведзены на 5-дзённы працоўны тыдзень з двума выхаднымі. Павелічэнне заработнай платы, а таксама памераў пенсій і льгот вяло да росту грашовых даходаў насельніцтва. У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гг. узрос агульны дэфіцыт прадметаў спажывання. Прычынай дэфіцыту стала больш хуткае развіццё цяжкай прамысловасці ў параўнанні з лёгкай, арыентаванай на вытворчасць тавараў народнага спажывання. Калі на Захадзе назіраўся бум выпуску спажывецкіх тавараў — аўтамабіляў, тэлевізараў, моднага адзення, то для савецкіх людзей усё гэта было маладаступным. У сярэдзіне 1960-х гг. абсалютная большасць насельніцтва БССР абыходзілася без кватэрных тэлефонаў, радыёпрыёмнікаў, тэлевізараў і халадзільнікаў. У 1970—1980-я гг. з развіццём адпаведных галін прамысловасці сталі распаўсюджвацца пральныя машыны, халадзільнікі і пыласосы, газавыя і электрычныя пліты. Разам з тым вытворчасць звыклых для нас сёння каляровых тэлевізараў, персанальных камп'ютараў, відэатэхнікі знаходзілася ў зачаткавым стане.

№ 17

Да пачатку 1980-х гг. не ўдалося ў поўнай меры забяспечыць высокі ўзровень жыцця насельніцтва БССР. Вострай заставалася, напрыклад, жыллёвая праблема.

Правообладатель Издательский центр БГУ

У 1970—1980-я гг. на аснове індустрыяльнага буйнапанэльнага домабудавання ў гарадах сталі ствараццa новыя жылыя мікрараёны.

**Замаруджванне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы. Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця.** У 1970-х — першай палове 1980-х гг. знізіліся паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця як у СССР у цэлым, так і ў БССР. У канцы 1970-х гг. увогуле спыніўся рост рэальных даходаў насельніцтва. Гэта было абумоўлена экстэнсіўным шляхам развіцця эканомікі, выкарыстаннем састарэлых тэхналогій і абсталявання ў большасці галін прамысловасці.

Велізарныя сродкі, якія дзяржава накіроўвала на патрэбы сельскай гаспадаркі, выкарыстоўваліся не заўсёды мэтазгодна. Дзяржава пастаянна павышала закупачныя цэны на мяса, малако, збожжа. Прадаваліся ж тыя прадукты насельніцтву па вельмі нізкім кошце. Розніца паміж высокай цаной пры закупцы і нізкай пры продажы вяла да страт з боку дзяржавы. Пачаўся спад вытворчасці прадуктаў харчавання. Для забеспячэння імі насельніцтва была ўведзена сістэма талонаў. Аднак у параўнанні з іншымі савецкімі рэспублікамі БССР лічылася адной з лепшых у плане задавальнення патрэб насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі.

Ва ўмовах палітыкі перабудовы ў другой палове 1980-х гг. партыйным кіраўніцтвам СССР быў абраны курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Гэты курс быў звязаны з пераходам да інтэнсіўнага шляху развіцця эканомікі. Ён прадугледжваў павелічэнне якасных паказчыкаў за кошт выкарыстання найноўшых дасягненняў навукі і тэхнікі, прыярытэтнага развіцця машынабудавання, росту прадукцыйнасці працы.

Пры ажыццяўленні плана развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1986—1990 гг. пашыраліся правы прадпрыемстваў і іх самастойнасць, укаранялася самафінансаванне. Пры самафінансаванні прадпрыемства само павінна было зарабляць грошы за кошт даходаў ад рэалізацыі сваёй прадукцыі і не мець патрэбы ў дзяржаўным фінансаванні. Дзякуючы гэтым эканамічным метадам прадпрыемствы атрымалі магчымасць большую частку прыбытку пакідаць у сябе і выкарыстоўваць у сваіх інтарэсах.

Галоўным дасягненнем эканамічнага развіцця БССР у другой палове 1980-х гг. стала паступовая пераарыентацыя з выпуску тавараў цяжкай прамысловасці (машын, станкоў, абсталявання) на выпуск тавараў лёгкай прамысловасці. Упершыню тавары народнага спажывання па аб'ёме сваёй вытворчасці сталі выпускацца апераджальнымі тэмпамі.

Аднак пошукі шляхоў перабудовы эканамічных адносін у другой палове 1980-х гг. рэальных вынікаў не далі. Сацыяльна-эканамічнае становішча працягвала пагаршацца. Нарастала інфляцыя — абясцэньванне папяровых грошай у выніку выпуску іх у абарачэнне без забеспячэння неабходнай колькасцю тавараў і падзенне пакупной здольнасці грошай у выніку павышэння цэн на тавары і паслугі.

**Чарнобыльская катастрофа і яе наступствы для насельніцтва і гаспадаркі Беларусі.** Сацыяльна-эканамічнае становішча БССР пагоршылася ў сувязі з ава-



Правообладатель Издательский центр БГУ

рыяй **26 красавіка 1986 г.** на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, якая размяшчалася на тэрыторыі Украіны (**2). **Чарнобыльская катастрофа** — самая маштабная тэхнагенная катастрофа XX ст. Яе наступствы былі вельмі цяжкімі для Беларусі. Ад радыеактыўнага забруджвання пацярпелі 17 еўрапейскіх краін. Асноўны ўдар прыпаў на Беларусь, Украіну, Расію.




Забруджванне тэрыторыі Беларусі пасля чарнобыльскай катастрофы

1. *Вызначце з апорай на картасхему, чаму Вярхоўны Савет БССР прызнаў зонай экалагічнага бедства ўсю тэрыторыю Беларусі.*
2. *Даведайцеся пра перыяды паўраспаду радыеактыўных элементаў, выкінутых у паветра ў выніку выбуху на Чарнобыльскай электрастанцыі.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Помнік «Звон Нагасакі» каля Чырвонага касцёла ў Мінску. Устаноўлены ў 2000 г.



? *Папрацуйце з фотаздымкам, выкарыстоўваючы прыём загадкавай карцінкі. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*

Аварыя нанесла Беларусі страты, роўныя 32 рэспубліканскім бюджэтам 1985 г., — 23,3 % тэрыторыі нашай краіны забруджана радыеактыўнымі ізатопамі, якія доўга не распадаюцца. Для параўнання: па ўдакладненых па стане на 2016 г. звестках пасля аварыі было забруджана 6,9 % тэрыторыі Украіны і 0,34 % тэрыторыі Расіі. Ад радыеактыўнага забруджвання пацярпела 2,3 млн чалавек, г. зн. кожны пяты жыхар Беларусі. З гаспадарчага абарачэння было выведзена 20 % зямель. У ліпені 1986 г. Вярхоўны Савет БССР прызнаў усю тэрыторыю Беларусі зонай экалагічнага бедства.

На працягу некалькіх гадоў пасля аварыі кіраўніцтва СССР лічыла за лепшае трымаць большасць насельніцтва ў няведанні наконт магчымых яе наступстваў, каб пазбегнуць непажаданай сацыяльнай незадаволенасці. Адпаведна гэтаму дзейнічалі рэспубліканскія кіроўныя структуры, якія праводзілі палітыку замоўчвання стану радыеактыўнага забруджвання і яго ўплыву на здароўе людзей. Толькі ў 1989 г. з інфармацыі пра радыяцыйнае становішча ў Беларусі быў зняты рэжым сакрэтнасці.

№ 18,19

У беларускім сектары 30-кіламетровай зоны адсялення вакол станцыі быў створаны Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік. Урад БССР распрацаваў і прыняў доўгатэрміновую дзяржаўную праграму ліквідацыі наступстваў аварыі. З забруджаных тэрыторый на новае месца жыхарства было адселена больш за 135 тыс. чалавек. Для перасяленцаў будавалася новае жыллё. Адсяленне, лячэнне і аздараўленне людзей, стварэнне належных умоў для працы і жыцця на пацярпелых тэрыторыях застаюцца адной з найважнейшых праблем у развіцці эканомікі Беларусі і цяпер.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Такім чынам, эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1960-х — 1980-я гг. было звязана з далейшым фарміраваннем індустрыяльнага грамадства ў асноўным па экстэнсіўным шляху. Наспяванне застойных з'яў у эканоміцы патрабавала пошуку шляхоў яе далейшага рэфармавання. Гэта абумовіла выбар курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, які прадугледжваў выкарыстанне інтэнсіўных гаспадарчых фактараў.

***Новыя паняцці і тэрміны***: *чарнобыльская катастрофа.*

****1.** Восенню 1977 г. пры ўборцы бульбы ў Дубровенскім раёне 17-гадовы юнак з Аршанскага педагагічнага вучылішча **Міхась Мароз** вынес з поля і накрыў сабой артылерыйскі снарад часоў Вялікай Айчыннай вайны. Міхась убачыў чорны, пакрыты зямлёй і ржой снарад, выхаплены бульбаўборачным камбайнам са свежаразаранай баразны. Снарад рухаўся па транспарцёры разам з бульбянымі клубнямі. Калі яго заўважылі, спыняць камбайн было позна — выбух мог адбыцца ад вібрацыі. Міхась асцярожна падхапіў снарад і панёс яго, ідучы па разараных баразнах да краю поля, далей ад людзей. Ісці па размоклай ад дажджу зямлі, калі яна ліпла да гумавых ботаў, было нязручна. Ды і снарад на выцягнутых руках несці было цяжка і небяспечна. Крокаў сто пяцьдзясят заставалася да краю поля, калі грымнуў выбух.



М. Мароз

Амаль трое сутак урачы змагаліся за жыццё Міхася. Увесь гэты час сябры, аднакурснікі дзяжурылі пад вокнамі шпіталя, гатовыя тэрмінова дапамагчы сваёй крывёю, калі спатрэбіцца. Калі Міхась апрытомнеў і ўбачыў каля ложка маці, то першае, што спытаў, — як яна сябе адчувае, бо ведаў, што ў маці хворае сэрца. Ні словам не пашкадаваў, што першым схапіў і панёс ад камбайна той снарад. Пажаліўся на боль у назе, хоць яе ўжо не было — ампутавалі. Трывожыўся, як бы гэта раненне не перашкодзіла яго службе ў войску. Родныя і аднакурснікі спадзяваліся, што Міхась паправіцца. Але не збылося…

Міхась Мароз за мужнасць і самаадданасць, выратаванне жыцця калгаснікаў і навучэнцаў быў пасмяротна ўзнагароджаны баявым ордэнам Чырвонай Зоркі. У Жыткавічах у яго гонар усталяваны помнік. Яго імя насіць піянерская дружына ў школе, дзе ён вучыўся. На будынку школы ўстаноўлена дошка ў гонар юнага героя.

***1.*** *Адкажыце на пытанне маці Міхася Мароза: «Хіба можа вайна забіваць такіх юных праз трыццаць з лішнім гадоў пасля яе заканчэння?»*

***2.*** *Што б вы зрабілі ў падобнай сітуацыі? Свой адказ растлумачце. Выкарыстайце метадычную параду «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**2. Пажар, што ўзнік на адным з блокаў Чарнобыльскай АЭС, удалося лакалізаваць дзякуючы самаахвярнасці пажарных, у тым ліку ўраджэнца Гомельшчыны **Васіля Ігнаценкі**. З жонкай Людмілай яны жылі ў горадзе Прыпяці, што ва Украіне, разам з іншымі, хто працаваў на Чарнобыльскай АЭС. Васіль служыў тут у пажарнай часці. Яны з Людмілай зусім нядаўна ажаніліся і чакалі дзіця. Аварыя здарылася не ў яго змену. Аднак, убачыўшы полымя над станцыяй, ён узяў непасрэдны ўдзел у тушэнні пажару. Падняўся на дах ахопленага полымем рэактара, выратаваў жыцці трох пажарных, што страцілі прытомнасць з прычыны высокага ўзроўню апрамяньвання. Атрыманая ім доза радыяцыі была смяротнай. Крыху больш за два тыдні ў шпіталі яго наведвала жонка Людміла, не ўсведамляючы небяспеку для сябе і іх будучага дзіцяці. Ёй казалі, што перад ёю ўжо не муж і каханы чалавек, а радыяцыйны аб’ект. А яна, як заклінанне, паўтарала ў палаце: «Я цябе кахаю, мой Васечка!» Імкнулася выратаваць любімага чалавека сілай свайго кахання. Праз два месяцы пасля смерці мужа Людміла нарадзіла дачку, якая пражыла пяць гадзін. Разам з Васілём яны яшчэ да нараджэння назвалі яе Наталляй. На магілкі Людміла прыносіць кветкі ім абодвум: мужу і дачцэ.



Васіль і Людміла Ігнаценкі

25-гадовы пажарнік быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Баявога Чырвонага Сцяга. За подзвіг у імя жыцця цяперашняга і будучых пакаленняў, асабістую мужнасць і самаахвярнасць В. Ігнаценка ў 2006 г. атрымаў званне Героя Украіны. Яму ўсталяваны помнік у Брагіне. Імя гераічнага пажарнага носіць адна з мінскіх вуліц. Удзельнікі пераадолення наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС атрымалі ў народзе празванне «ліквідатары».

Вось так у жыцці асабістая адвага і самаахвярнасць, пакуты і каханне ідуць поруч. Вы ж ужо ведаеце, што такое любіць маці і тату, бабулю і дзядулю, сястру ці брата. І ў вашым жыцці будзе каханне, дзеля якога ахвяраваў сваім жыццём наш суайчыннік Васіль Ігнаценка.

*Як вы лічыце, у чым заключаецца сіла кахання?*

1. Вызначце, чаму БССР у народзе называлі «зборачным цэхам Савецкага Саюза».
2. Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж будаўніцтвам Салігорскіх калійных камбінатаў, Гомельскага суперфасфатнага і Гродзенскага азотна-тукавага заводаў, выкарыстаннем мінеральных угнаенняў у працэсе хімізацыі сельскай гаспадаркі і ўзнікненнем экалагічных праблем.



Правообладатель Издательский центр БГУ

3. Вызначце прыметы экстэнсіўнага і інтэнсіўнага шляхоў развіцця эканомікі ў змесце наступнай інфармацыі: «Пераход прадпрыемстваў да гаспадарчага разліку і самафінансавання садзейнічаў у 1986—1989 гг. росту аб'ёму прамысловай прадукцыі ў Беларусі на 27 % і павышэнню прадукцыйнасці працы на 26 %».
4. Выкажыце меркаванне, чаму беларускі мастак Міхаіл Савіцкі назваў адну са сваіх карцін «Чарнобыльская мадонна». Які сюжэт гэтага твора?
5. Ці варта характарызаваць аварыю на Чарнобыльскай АЭС як маштабную экалагічную і тэхнагенную катастрофу, у тым ліку для Беларусі? Правядзіце дыскусію па гэтым пытанні. Выкарыстайце адпаведную метадычную параду на с. 178.



Чарнобыльская мадонна. Мастак *М. Савіцкі*. 1986—1990 гг.

## § 24—25. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў другой палове 1940-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** **1.** Чаму развіццё адукацыі ў БССР у 1920—1930-я гг. характарызуецца як «культурная рэвалюцыя»?
**2.** Якія з твораў мастакоў Валянціна Волкава і Міхаіла Савіцкага вам вядомы?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць ролю адукацыі ў станаўленні індустрыяльнага грамадства, унёсак ураджэнцаў Беларусі ў развіццё навукі, а таксама гістарычныя сюжэты ў беларускай літаратуры і мастацтве.

**Развіццё сістэмы народнай адукацыі.** У пасляваенны перыяд для аднаўлення школ патрабавалася адрамантаваць ці нанава ўзвесці будынкі, наладзіць выпуск школьнага абсталявання, вучэбнай літаратуры, падрыхтаваць настаўнікаў. Рамонтам і будаўніцтвам школ займаліся не толькі будаўнікі, але і настаўнікі, бацькі вучняў і вайскоўцы.

З дакладной запіскі пасляваеннага часу загадчыка Магілёўскага абласнога аддзела адукацыі: «Калі ў школах не было партаў, дык з дошак збівалі даўжынёй на 5—6 месцаў нешта падобнае да парты, якая ў будучым як экспанат павінна трапіць у музей. Калі ў вокнах захаваліся некалькі шыбаў, дык яны вымаліся і імі зашклялася адно акно, а астатнія забіваліся дошкамі. Калі не было класнай дошкі — рабілася рама, а на яе набіваўся ліст абгарэлай бляхі, на якой добра трымаўся след ад цвёрдага кавалка белай гліны, што замяняла крэйду».

Правообладатель Издательский центр БГУ